


## У НУМАРЫ


| <u>**Навіны**</u> | <u>**Навуковая праца**</u> |
| --- | --- |
| **“Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст.”. Разглядаем дэталі…** | **Журнал “Нива”** |
| **Свята ў Заслаўскай дзіцячай школе мастацтваў** | **Лекцыя “Кропкі фотагісторыі: Заслаўе на фотаздымках 1950-60-х гг.”** |
| | **Заслаўе ў беларускай культуры** |


## <u>Навіны</u>

### *“Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст.”. Разглядаем дэталі…*

Зараз у выставачнай зале музея-запаведніка “Заслаўе” работае часовая экспазіцыя “Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст.” .

Экспазіцыя гэтага праекта ілюструе невялічкі перыяд з тысячагадовай гісторыі Заслаўя — усяго толькі 38 год існавання Заслаўскага раёна. Амаль што чатыры дзесяцігоддзі, кавалак часу з 1920-х па канец 1950-х гг., з жыцця мястэчка на выставе прадстаўленыя фотавыявамі. Чаму менавіта здымкі былі выбраны асноўным музейным прадметам, чаму яны сталі музейным сродкам для размовы з наведвальнікам аб гэтым перыядзе?

Спецыялісты, якія займаюцца гістарычнымі даследаваннямі, гісторыяй будзённасці, гістарычнай фатаграфіяй, сцвярджаюць, што фотаздымкі з’яўляюцца надзейнымі нагляднымі крыніцамі ведаў аб мінулым. Яны здольныя пацвярджаць дакладнасць падзей і ў той жа час яны ствараюць своеасаблівую “віртуальную” рэальнасць.

З’яўленне фотаздымка і магчымасці зафіксаваць чалавека і падзею безумоўна паўплывалі на многія працэсы, у тым ліку і на грамадскую свядомасць, традыцыі і побыт.

Для тых, хто займаецца экспедыцыйнай дзейнасцю, фотавыявы надзейна замацаваліся ў свядомасці як асацыяцыя з вясковымі і гарадскімі хатамі беларусаў. Шматлікія партрэты, аб’яднаныя ў адну вялікую фотарамку, своеасаблівы фотакалаж, часта можна ўбачыць на сценах вясковых хат разам з абразамі. Фотаздымкі родных — адзіныя візуальныя вобразы — беражліва захоўвалі і часта ў моманты небяспекі іх аднымі з першых намагаліся вырataваць. Нам вядомыя шматлікія гісторыі, калі пад страхам за жыццё і маёмасць падчас вайны гаспадары закопвалі свае небагатыя пажыткі і, галоўным чынам, у гэтых хованках зберагалі фотакарткі.



*Фрагмент экспазіцыі з партрэтам Бурундуковай Я.М.*

Вядома, што фотаздымкі захоўвалі ў медальёнах і кулонах, партманетках, беражліва захутвалі ў насоўкі і насілі з сабой у клунках, а маладзёны, якія выпраўляліся на вайсковую службу ці на вайну, насілі выявы родных і блізкіх у кішэні гімнасцёркі ля сэрца або ў рэчмяшку за спінай. Гэта паказвае нам на ўласцівасць фотаздымка ўвесь час, асабліва пры дужай патрэбе, быць убачаным і ўзноўленым, што робіць іх безумоўна каштоўнымі.

Вялікая распаўсюджанасць фотаздымкаў указвае яшчэ і на такую ўласцівасць здымка, як зразумеласць. Гледзячы на выяву з умовай, калі нам вядомы гістарычны і культурны кантэкст, мы зразумеем, што гэты фотаздымак зроблены падчас хаўтур, гэты – падчас вайсковай службы, а гэта – вясельная фотакартка.

Безумоўна, усе даследчыкі ў адзін голас скажуць, што фотаздымкі прадстаўляюць інфармацыю, якую нельга атрымаць з тэкстаў ці расповедаў відавочцаў, і якая вельмі карысная пры працы па гістарычным даследаванні.

Відавочна, што фотаздымак з’яўляецца і адной з асноўных крыніц гістарычнага даследавання, а таксама ён з’яўляецца вялікай складовай

часткай музейнага фонду. Так, у зборы Заслаўскага музея-запаведніка зараз захоўваецца амаль што 2 тысячы фотаздымкаў. Гістарычны перыяд, які яны ілюструюць, – большы за стагоддзе. Зразумела, што кожны з фотаздымкаў выбітны і вельмі каштоўны для захавання гісторыі Заслаўся.

У цэнтральнай частцы залы на выставе прадстаўленыя фотаздымкі, створаныя на працягу 1950-ых гадоў. Нібыта ў паветры лётаюць здымкі і партрэты людзей, якія жылі і працавалі ў нашым мястэчку. Кожны з іх цікавы і выбітны па-свойму, пра кожны можна нешта расказаць. Але сёння нашая ўвага сканцэнтруецца на партрэце маладой жанчыны, якая, абапіраючыся на спінку крэсла, нібы сарамліва абдымае абедзвюма рукамі твар. На ім сфатаграфаваная Яўгенія Мікалаеўна Бурундукова ў 1958 ці ў 1959 годзе. Разам з гэтай фотакарткай у збор музея ў 2000 годзе трапіў і фотаздымак маці Яўгеніі Мікалаеўны, а таксама Інструкцыя пуцявому вартаўніку (1932 г.) і Табель ацэнкі ведаў, паводзін і стараннасці (1948 г.), якія належалі бацьку Яўгеніі Мікалаеўны – Янчэўскаму Мікалаю Аляксандравічу. Атрымліваецца, што сёння музей-запаведнік захоўвае “візуалізацыю” сям’і, а ў 2000-ым годзе Юрась Малаш, супрацоўнік музея-запаведніка, яшчэ і запісаў гісторыю сям’і Яўгеніі Мікалаеўны. Гэты запіс-інтэрв’ю змешчаны на старонках кнігі “Памяць : Гісторыка-дакументальная хроніка Заслаўя”. Зараз жа мы змесцім успамін Яўгеніі Мікалаеўны як ажыўленую рэчаіснасць, “зафіксаваную” на фотаздымку ў канцы 1950-ых гадоў у Заслаўі:

“Выслалі нас з Заслаўшчыны недзе ў 1930-ыя гады, дакладна не памятаю, бо была яшчэ маленькая. Жылі мы ў Архангельску, Усцюгу, Ухтыме. Майго бацьку вельмі паважалі зняволеныя, бо ён чытаў пропаведзі. Да высылкі быў ён дыяканам, за гэта нас і рэпрэсавалі. Умовы жыцця былі жахлівымі, харчаваліся марошкай, атожылкамі. Потым мы збеглі. Маці пасадзіла малодшую сястру ў заплечны мяшок. Бацька ўзяў мяне за руку, і такім чынам мы два дні ішлі праз лес. У Архангельску прытуліў мясцовы святар. Мы хаваліся на гарышчы яго хаты. Ён нам дапамог трапіць у Котлас, даў крыху грошай і ежы, пасадзіў на цягнік. Усе гэтыя падзеі былі перад пачаткам вайны. Мы прыехалі ў Барысаў. Не ведаю, чаму мы засталіся ў гэтым горадзе. Бацька працаваў на чыгунцы, маці – там жа прыбіральшчыцай, мяне адвезлі ў Заслаўе да бабулі. Пачалася вайна, я жыла з бабуляй. Памятаю, як прыходзілі немцы і прасілі, каб мы іх пакармілі. Потым немцы самі сталі прыносіць нам хлеб. У хуткім часе з Барысава прывезлі маіх бацькоў. Аднойчы немцы забралі бацьку, жорстка збілі, прымусілі апрануць рызу, а потым збілі яшчэ больш, прымусілі яго спяваць “Кацюшу” у царкве. Я і бабуля пайшлі прасіць за бацьку. Калі мы падыходзілі да царквы, немец крыкнуў: “Пароль”. Бабуля

была старэнькая і, недачуўшы, сказала: “Я не кароль, я Янушэўская”. Тады мы ледзь не загінулі. У канцы вайны быў яшчэ адзін выпадак. Каля нашай хаты, якая знаходзілася недалёка ад нямецкай казармы (сёння ў гэтым будынку заслаўская пошта) [цяпер будынак па вул. Вялікая, 28 не эксплуатуецца – *заўвага К.С.*], мы знайшлі мёртвага немца. Дзве нашыя суседкі перанеслі яго на наш гарод і там яго пахавалі, паклаўшы на грудзі яго фотакартку, на якой сфатаграфаваны ён, жанчына (мабыць, жонка) і двое дзяцей. Па сённяшні дзень невядомы нямецкі салдат ляжыць на маім гародзе, пахаваны пад валуном [запісана ў 2000-ым годзе – *заўвага К.С.*].

Пасля вайны мой бацька, Мікалай Андронаў [Мікалай Аляксандравіч згодна з дакументамі аб перадачы прадметаў на пастаяннае захоўванне ў збор музея-запаведніка – *заўвага К.С.*], быў святаром у Красным. Я працавала трыццаць дзевяць гадоў у чыгуначным магазіне. Гэты магазін і зараз называюць “Жэнькіным” [цяпер, крама “ДорОрс” – *заўвага К.С.*]”.

Нажаль, фотаздымак Яўгеніі Мікалаеўны не мае ніякай інфармацыі пра фатографа, а таксама аб дакладным часе і месцы здымак. Нам таксама невядома, для чаго ды ў якіх умовах ці пры якіх акалічнасцях яго зрабілі. Але верагодна, што запіс інтэрв’ю быў зроблены падчас разглядання фотаздымкаў з сямейнага альбому Яўгеніі Мікалаеўны. І атрымліваецца, што вельмі часта здымкі з’яўляюцца натхняльнікам на аповед, на пэўны наратыў. Фотавыява звычайна выклікае даследчыка на разважанні, пытанні і асацыяцыі, якія наўпрост не звязаныя са здымкам, але дазваляюць паглыбіцца ў тэму.

*Ксенія Сямашка,*
*ст. навуковы супрацоўнік*

**Свята ў Заслаўскай дзіцячай школе мастацтваў**

23-га лістапада ў Заслаўскай дзіцячай школе мастацтваў адбылася ўрачыстая прэзентацыя ілюстраванай кнігі вершаў “Мастак-чарадзей”. Аўтарам вершаў з'яўляецца заслаўская паэтка Святлана Быкава, аўтарам ілюстрацый (акварэляў) – даўні сябра нашага музея мастак Віктар Данілаў.

У межах урачыстасці на базе Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў адбывалася таксама і выстава акварэляў Віктара Данілава, прымеркаваная да Міжнароднага дня акварэлі. Супрацоўнікі нашага музея з задавальненнем аказалі мастаку дапамогу ў правядзенні дадзенай выставы: у транспартыроўцы прац, іх мантажы і дэмантажы.

Уласна прэзентацыя адбылася ў актавай зале. Прыемна, што яна была поўнай – нямала змясцілася ў ёй гасцей. Прысутнічалі, у тым ліку,

прадстаўнікі ўсіх сярэдніх агульнаадукацыйных навучальных устаноў горада: ДУА “Заслаўская СШ №1”, ДУА “Заслаўская СШ №2 ім. М.К. Пуцейкі”, ДУА “Заслаўская гімназія”.



*Віктар Данілаў і вучні ДУА “Заслаўская СШ №2 ім. М.К. Пуцейкі” у фае Заслаўскай школы мастацтваў; фота ўзята з афіцыйнай анлайн-старонкі выдавецтва “Народная асвета”*




*Злева-направа: Віктар Данілаў, Святлана Быкава, Святлана Карташова, Валерый Шкурскі на сцэне ў Заслаўскай школе мастацтваў; фота ўзята з афіцыйнай анлайн-старонкі выдавецтва “Народная асвета”*

Кніга “Мастак – чарадзей” знаходзіцца ў продажы – не прамініце набыць сабе часцінку заслаўскай гісторыі і прыгажосці, дадаць яе ў сваю хатнюю бібліятэку. На старонках гэтай кнігі штосьці блізкае для душы знойдуць як дарослыя, так і дзеці.

Са свайго боку, калектыў нашага музея шчыра віншуе аўтараў кнігі – Святлану Быкава і Віктара Данілава з іх творчым поспехам, а таксама зычым новых удалых здзяйсненняў!

*Падрабязней даведацца пра адзначаную вышэй урачыстасць магчыма, скарыстаўшыся спасылкай (афіцыйная анлайн старонка выдавецтва “Народная асвета”): https://narasveta.by/vse-novosti/3961-23-noyabrya-proshla-prezentatsiya-knigi-svetlany-bykovoj-mastak-charadzej*

## Навуковая праца

### Журнал “НИВА”

В 1989 году в самом начале существования заповедника “Заславль” на фондово-закупочные комиссии приезжали опытные сотрудники Государственного музея БССР (так тогда назывался Национальный исторический музей). Среди них был и Леонтий Дмитриевич Клок – старейший сотрудник этого музея, собиратель редких изданий. Благодаря ему фонды заповедника пополнились подписками журнала “Нива” за 1907-1908 годы. Кстати, этот журнал нам очень пригодился при создании постоянной экспозиции “Торговая лавка конца XIX – начала XX века” (далее – “Лавка”), в том числе – в процессе определения популярных товаров того времени, а также размещения в “Лавке” оригинальных примеров рекламы.



Часопісы “Нива” з фондаў ДУ “ГКМЗ “Заслаўе”, пачатак XX ст.

Еженедельный журнал “Нива” был популярен в Российской империи, имел большое количество подписчиков, издавался с середины XIX по первую треть XX в. в Санкт-Петербурге. Ориентирован он был на широкую аудиторию читателей, главным образом – на жителей городов Российской империи, в сегменте которых особо выделялся семейный читатель: материалы подбирались под разные возрастные категории. Журнал был

иллюстрированным, снабжался приложениями различной тематики, которые печатались в дополнение к основному материалу.

На страницах “Нивы” можно было увидеть советы, шарады, ребусы, рекламу, новости из общественной жизни, гравюры, фотоиллюстрации и прочее. В приложениях к журналу печатались произведения русских и зарубежных литераторов, репродукции картин известных художников и другие материалы.

Основателем журнала “Нива” был Александр Фёдорович Маркс, который стремился все прибыли от продаж вкладывать в дальнейшее развитие журнала и благотворительность. После смерти А.Ф. Маркса остался капитал в 500 тысяч рублей. Вся эта сумма была завещана им перед смертью на нужды благотворительности.



Фрагмент вокладкі часопіса “Нива” з фондаў ДУ “ГКМЗ “Заслаўе”, пачатак XX ст.



Рэклама з часопіса “Нива” з фондаў ДУ “ГКМЗ “Заслаўе”, пачатак XX ст.




Ілюстраваныя матэрыялы з часопіса “Нива” з фондаў ДУ “ГКМЗ “Заслаўе”, пачатак ХХ ст.




Фотаілюстрацыя з часопіса “Нива” з фондаў ДУ “ГКМЗ “Заслаўе”, пачатак ХХ ст.

За всю историю журнала “Нива” мир увидел 2,5 тысячи его номеров и более 50 миллионов бесплатных приложений. Он стал, наряду со своими приложениями, занимательным “чтивом” для миллионов людей, поспособствовал развитию кругозора миллионов читателей, стал основой многих домашних библиотек. Просуществовав почти полвека, данное

издание стало “рекордсменом” в ряду русских периодических изданий и было сравнимо по популярности со многими всемирно известными продолжающимися печатными изданиями.

Ирина Артемьева,
ст. н. с. отдела фондов

**Лекцыя “Кропкі фотагісторыі: Заслаўе на фотаздымках 1950-60-х гг.”**
*/для вучняў 9-11 класаў; працягласць – 45 хв./*

**Мэта**

Раскрыццё пэўных аспектаў візуальнай гісторыі Заслаўя і яго жыхароў у 1950-1960-я гг.

**Задачы**

1) сфармаваць агульнае уяўленне аб развіцці сферы фатаграфавання ў Беларусі, засяродзіць увагу на некаторых акалічнасцях развіцця гэтай сферы ў Заслаўі, асабліва ў 1950-1960-х гг.;
2) паўплываць на развіццё ў вучняў умення працаваць з фотадакументамі;
3) выхоўваць пачуццё павагі да папярэдніх пакаленняў, да фотадакументаў, якія па іх засталіся, а таксама – інтарэс да гісторыі Беларусі, роднага горада і сваёй сям’і.

**План**

1. Агульная інфармацыя і ўводзўіны ў тэму
2. Выкладанне асноўнага матэрыяла па тэме

**1.** Гісторыя з’яўлення фотаапаратаў і фотаздымкаў адносіцца да XIX ст., менавіта тады вынаходзіцца спосаб атрымання прыстасаванняў для атрымання адбіткаў на спецыяльных пласцінах. Шмат для развіцця і ўдасканалення гэтага вынаходніцтва зрабіў наш зямляк Сігізмунд Юркоўскі, які паходзіў з Віцебшчыны. Першапачаткова праца стварэння фотаздымкаў была вельмі складанай тэхнічна, патрабавала ўмення працы са спецыяльнымі рэактывамі і матэрыяламі. Фотаапараты былі вельмі дарагімі і іх было няшмат. Працэс фатаграфавання нярэдка адбываўся ў спецыяльных атэлье (фотаатэлье), дзе можна было атрымаць сваю фотакартку ў звычайным афармленні або з выкарыстаннем спецыяльных штучных эфектаў фону. Пэўны час нават існавала меркаванне, што фотаздымкі цалкам заменяць сабой класічны жывапіс, але гістарычна адбылося так, што класічны жывапіс як мастацтва захаваўся, але і фота атрымала магчымасць развіцця ў новай галіне творчасці – фотамастацтве.

У Беларусі атэлье згаданага вышэй кшталту таксама, як і шмат дзе ў іншых рэгіёнах Расійскай імперыі, у склад якой тады ўваходзілі беларускія землі, узніклі ў шэрагу гарадоў і мястэчак у канцы XIX-пачатку XX стст. Паслугі фатаграфавання тады каштавалі даволі дорага, таму імі, у асноўным, карысталіся заможныя жыхары гарадоў і мястэчак, шляхта (дваране), зрэдку – сяляне. Што тычыцца сялян, то яны нярэдка мелі адно фота за ўсё жыццё, а часам – нават і ніводнага. Да фатаграфавання рыхтаваліся, як да пэўнай урачыстасці, апраналіся ў лепшае адзенне, бо ведалі, што гэта рэдкі выпадак, які можа болей ужо ніколі і не паўтарыцца.

Адначасова трэба памятаць пра тое, што фотаапараты існавалі не толькі ў межах спецыялізаваных атэлье, але былі і ў выкарыстанні фотааматараў, а колькасць прыватных карыстальнікаў фотаапаратамі з часам усё больш і больш павялічвалася, паляпшалася і якасць гэтых прыстасаванняў, аднак гэта не было надта хуткім працэсам.

Згодна з меркаваннем галоўнага захавальніка фондаў ГКМЗ “Заслаўе” А.К. Рака, фотаатэлье ў Заслаўі ў канцы XIX-пачатку XX стст., на жаль, не існавала. Таксама ён мяркуе, што жыхары мястэчка тады не мелі на руках уласных фотаапаратаў, што выглядае цалкам праўдападобным [1].



*Заслаўскі аддзел міліцыі, 1950-я гг.; фота з фондаў ДУ “ГКМЗ “Заслаўе”*

Датычна часу да Другой сусветнай вайны і пазней, маем казаць аб якасным пашырэнні фотапаслуг для грамадства ў Беларусі, а таксама аб павелічэнні кола фотааматараў. У першым выпадку ідзе гаворка аб фотаздымках для дакументаў, а таксама – фотаздымках з розных урачыстасцяў (вяселляў, провадаў у войска і іншых) на памяць для сябе, радні і сяброў, зробленых прафесіяналамі. У другім выпадку фатографамі

выступалі непрафесіяналы: людзі, якія набылі фотаапараты ўласна для сябе, здымалі тое, што ім падабалася. Часам такія аматары дасягалі ўзроўню не горшага або блізкага да прафесіянальнага ў справе стварэння якаснага фота і яго праяўкі. Праявіць фота, перавесці яго з негатыва (плёнкі) ў папяровую выяву было не надта проста. Для гэтага трэба было мець набор рэактываў, умець правільна іх выкарыстоўваць, падрыхтаваць памяшканне пад імправізаваную лабараторыю праяўкі, дзе фотаздымкі прасушваліся ў цемры. Гэта, насамрэч, была цэлая навука, са сваімі правіламі і заканамернасцямі.

Датычна Заслаўя трэба зрабіць асобную заўвагу наконт справы фатаграфавання, якая на пэўны перыяд была тут даволі значна абмежавана. З 1921 па 1939 гг. Заслаўе было памежнай тэрыторыяй з Польшчай, з 1924 г. тут існаваў 15-ы (Заслаўскі) памежны атрад войскаў НКВД, разнастайныя аб’екты ваеннай інфраструктуры, таму свабодна фатаграфаваць тутэйшыя ваколіцы (краявіды) было забаронена, гэта магло быць прынята за шпіянаж і цягнула б за сабой вельмі сур’ёзную адказнасць. Аднак, гэта не накладала забароны на прыватныя фотаздымкі партрэтнага кшталту, на якіх, напрыклад, выяўляліся выхаванцы дзіцячых грамадскіх установ, сямейныя партрэты, фотаздымкі у інтэр’еры хаты або ў двары. Таму можам казаць, што фотаздымкі тым часам у Заслаўі рабіліся, але ў вельмі малой колькасці, пра тое, што карыстанне прыватнымі фотаапаратамі ў памежнай зоне жорстка рэгламентавалася [1].



*Дэманстрацыя, з самаробнай зоркай; фота з фондаў ДУ “ГКМЗ “Заслаўе”*

У час вайны і пасляваеннай адбудовы разбуранай вайной гаспадаркі, не асабліва было да разгортвання справы фатаграфавання, але менавіта ў час пасляваеннага аднаўлення для яе якраз і былі закладзеныя асновы, дадзены новы штуршок развіцця. Тады аднавіліся старыя, а таксама запрацавалі новыя прадпрыемствы, якія выраблялі фотаапараты і патрэбныя для іх абслугоўвання матэрыялы: плёнку, рэактывы,

фотапаперу. Гэта дало магчымасць зрабіць да 1950-1960-х гг. набыццё фотаапарата і патрэбных для яго выкарыстання матэрыялаў больш даступным для звычайнага грамадзяніна, хаця тут жа варта адзначыць і тое, што якасны фотаапарат таксама каштаваў не зусім танна, але, параўнальна з ранейшым часам, значана танней. Працягвалі сваю працу і спецыяльныя фотаатэлье, дзе можна было замовіць патрэбныя фотаздымкі, а таксама, пры нежаданні або немагчымасці зрабіць праяўку ўласнай плёнкі самастойна, замовіць праяўку гэтай плёнкі і, заплаціўшы за яе, атрымаць гатовыя фотаздымкі.



*Брыгада хуткай дапамогі Заслаўскага раёна, 1950-я гг.;*
*фота з фондаў ДУ “ГКМЗ “Заслаўе”*




*Дзень працы – 1 мая 1956 г., група лекараў; фота з фондаў ДУ “ГКМЗ “Заслаўе”*

Хоць фотаздымкаў 1950-1960-х гг. з выявай краявідаў Заслаўя і партрэтамі яго жыхароў захавалася не надта каб і шмат, але смела можна казаць, што іх маецца нашмат больш, чым за ўсю палову стагоддзя (1900-1950), якая папярэднічала гэтаму часу. Дарэчы, тут трэба зрабіць

удакладненне наконт таго, што гутарка вядзецца пра фотаздымкі, якія захоўваюцца ў фондах гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Заслаўе”, без уліку тых выяў, якія захоўваюцца ў прыватнай уласнасці (хатніх архівах) жыхароў горада, у іншых населеных пунктах, куды яны былі звезены пры пераездах радні, фотаздымкаў, якія не захаваліся да нашага часу (былі спаленыя, выкінутыя, сапсаваліся пры неналежных умовах захоўвання і г.д.). *[працяг будзе – рэд.]*

*навуковы супрацоўнік музея*
*Ігар Кандратовіч*

---

[1] Рак, А.К. Заслаўе XX стагоддзя на фотаздымках. Заслаўскія зборы, №10 (люты 2021 г.), с. 16-17.

## Заслаўе ў беларускай культуры

Для вызначэння ролі пэўнага населенага пункта ў гісторыі краіны магчыма кіравацца самымі разнастайнымі крытэрыямі, звяртацца да розных сфер жыцця грамадства. Чым шырэйшым будзе гэтае поле параўнання, тым больш дакладным і прадстаўнічым можа быць вынік. Нашы чытачы лёгка могуць упэўніцца ў тым, што мы актыўна звяртаемся да адзначанага вышэй падыходу, згадаўшы папярэднія матэрыялы ў дадзенай рубрыцы газеты.

Зараз звернемся да вучнёўскай сферы – кожны з нас калісьці быў вучнем, нельга паспрачацца, што хіба не ўсё для чалавека пачынаецца са школы: робяцца першыя спробы спазнаць “навукі” гэтага свету, адбіваюцца першыя больш-менш асэнсаваныя ўспаміны. Так, напрыклад, многія на працягу ўсяго жыцця не перастаюць памятаць, як выглядаў іх школьны “Буквар”, даволі дакладна могуць узнавіць у памяці выгляд яго вокладкі. Вокладка кнігі-вучэбніка або вучэбнага дапаможніка – вельмі запамінальная рэч.

Далёка не кожны горад Беларусі можа пахваліцца тым, што выява, непасрэдна звязаная з ім, трапіла на вокладку вучэбніка або дапаможніка для вучняў, што яе пабачылі тысячы дзяцей, для якіх яна стала непасрэднай візуальнай згадкай аб прадмеце (вучэбным курсе), што вывучаецца. Наша Заслаўе цалкам можа гэта зрабіць.

Справа ў тым, што наш горад, праз музей-запаведнік, адлюстраваўся на вокладцы рабочага сшытка па гісторыі Беларусі для вучняў 6-га класа

аўтарства С.М. Цемушава. Гэты сшытак надрукаваны ў 2021 г. і выкарыстоўваецца ў межах засваення асноўнага навучальнага курса. На вокладцы гэтага выдання, якое будзе актуальным і ў 2022-2023 навучальным годзе, размешчаны габелен “Полацкія званы” аўтарства мастака Юрыя Піскуна, размешчаны ў экспазіцыі “Зал габеленаў” нашага музейна-выставачнага комплекса.




*Рабочы сшытак па вучэбным прадмеце “Гісторыя Беларусі” для навучэнцаў 6-га класа; аўтар – навуковец С.М. Цемушаў (да падручніка пад рэдакцыяй Ю.М. Бохана)*

Згаданы габелен, які мае непасрэдную сувязь з гісторыяй Заслаўя, у межах экскурсій і індывідуальных наведванняў пабачылі дзясяткі тысяч людзей, такім чынам ён стаў візуалізаванай згадкай аб Заслаўі. Пашырэнню гэтай візуалізаванай згадкі ўскосным чынам паспрыяў і друк выявы “Полацкіх званоў” на вокладцы рабочага сшытка для вучняў. Выбар дадзенай выявы стаў невыпадковым і чарговы раз пацвердзіў значнасць Заслаўя ў гісторыі і культуры Беларусі.

**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сабалеўская І.В., Арцемьева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.